ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 15 (897) | Аўторак, 17 кастрычніка 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

1 ◆ Навіны апошніх дзён.

2 ◆ Уручаны сорасаўскія дыпломы.

3 ◆ Па праблемах аздараўлення насельніцтва.

4 ◆ Юбілей вучонага-земляка. Адпачынак, які запамінаецца.

5 ◆ Застаецца ў нашай памяці. Вартавыя парадку.

6 ◆ Гомельшчына вачыма гасцей.

7 ◆ Да агляду талентаў.

8 ◆ Спартыўная хроніка.

*У рэктарацe*

## ПЕРААДОЛЬВАЦЬ УСЕ ЦЯЖКАСЦІ

Мінае дзень за днём, але наша эканамічнае і сацыяльнае становішча пакуль што не паляпшаецца. Яно яшчэ больш ускладняецца пры ўваходзе ў ацяпляльны сезон. Значна павялічыцца расход энергарэсурсаў, на што спатрэбіцца дадатковае фінансаванне. І не толькі на гэта. Цэны і затраты працягваюць расці па ўсіх пазіцыях. Усё гэта патрабуе ўмелага гаспадарання, выключнай ашчаднасці і адказнасці за стан спраў у кожным падраздзяленні. Менавіта ў такім накірунку ішла размова на рэктарацe нашага універсітэта пры абмеркаванні пытання аб забеспячэнні неабходных умоў для арганізацыі вучэбнага працэсу.

З інфармацыяй выступіў прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў. Ён узначальваў камісію, якая правярала санітарны стан вучэбных карпусоў, аўдыторый, лабараторый, наяўнасць вучэбнага абсталявання і многае іншае. Прыводзіліся канкрэтныя факты, якія сведчаць аб істотных недахопах і ўпушчэнннях. Гэта асабліва датычыць падрыхтоўкі да зімовага ўтрымання ўсіх універсітэцкіх памяшканняў. Патрэбна многае зрабіць для іх уцяплення, эканомнага расходавання электраэнергіі, гарачай і халоднай вады.

Больш прадумана і рацыянальна павінен выкарыстоўвацца аўдыторны фонд. Неадкладнага вырашэння патрабуюць і іншыя пытанні, ад якіх залежыць якасць вучэбнага працэсу.

На пасяджэнні рэктарата першы прарэктар прафесар М.В.Селькін паведаміў аб выніках ліквідацыі студэнтамі акадэмічных запазычанасцей, аб плане набору першакурснікаў на будучы навучальны год.

## АПОШНІ КРОК ДА ПАГАДНЕННЯ

Наш універсітэт наведала дэлегацыя Пізанскага універсітэта з Італіі. Яе ўзначальваў прафесар Гаэтана Барлета, які сёлета ўжо быў у ГДУ і чытаў лекцыі для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей, якія спасцігаюць навыкі псіхолагаў.

У час новай сустрэчы абмяркоўваліся і ўзгадняліся найбольш прынцыповыя дэталі рыхтуемага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж дзвюмя вышэйшымі навучальнымі ўстановамі краін. Яно будзе падпісана ў апошняй дэкадзе кастрычніка, калі з адказным візітам у г.Пізу прыбудзе рэктар ГДУ прафесар Л.А.Шамяткоў.

## УЗНАГАРОДЖАНЫ ГАНАРОВЫМІ ГРАМАТАМІ

За шматгадовую творчую навуковую, педагагічную і фізкультурна-спартыўную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці заслужаныя трэнеры Рэспублікі Беларусь, суддзя міжнароднай катэгорыі па баскетболу дацэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры Царыкаў Барыс Андрэевіч і старшы выкладчык гэтай жа кафедры старшы трэнер жаночай каманды па ручному мячу "Універсітэт" Крукоўскі Валерый Пятровіч узнагароджаны ганаровымі граматамі універсітэта.

◆ ◆ ◆

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць і падрыхтоўку маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання доктар тэхнічных навук, прафесар **МАКСІМЕЙ Іван Васільевіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

## *ВІНШУЕМ!*

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць кандыдатаў навук ВЯХІРАВА Мікалая Іванавіча і КУДЗІНА Віктара Панцялеевіча з кафедры радыёфізікі, ЖУЛЬКОВА Віктара Іванавіча з кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі з выпадку прысваення ім Атэстацыйнай калегіяй Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вучонага звання ДАЦЭНТ.***

## КАБІНЕТ МІНІСТРАЎ ВЫРАШЫЎ ДАПАМАГЧЫ АСПІРАНТАМ

У мэтах аказання фінансавай падтрымкі таленавітым маладым вучоным Кабінет Міністраў выдзеліў стыпендыі аспірантам у размеры пяці мінімальных заработных плат. Присуджацца яны будуць па ўмовах адкрытага конкурсу. Ён аб"яўлены Міністэрствам адукацыі і навукі сумесна з Акадэміяй навук, а таксама пры ўдзеле рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, занятых падрыхтоўкай аспірантаў.

Аднак атрыманне стыпендыі агаворана пэўнымі ўмовамі. Пры перамозе ў конкурсе для аспірантаў, якія вучацца ў аспірантуры пасля заканчэння ВНУ, стыпендыя вырасце з трох мінімальных зарплат да пяці, такім чынам, яна павысіцца для пераможцы на дзве мінімальныя зарплаты.

Для тых, хто вучыцца ў аспірантуры, але мае ўжо стаж па спецыяльнасці, а таксама стыпендыю, размер якой перавышае пяць мінімальных зарплат, перамога ў конкурсе азначае прыбаўку ў тыя ж дзве мінімальныя зарплаты.

Усяго Кабінетам Міністраў выдзелена сто стыпендый. Для вызначэння кандыдатаў на іх у кожным ведамстве, занятым падрыхтоўкай аспірантаў, будуць створаны конкурсныя камісіі, у якіх вопытныя эксперты ацэняць прадстаўленыя работы і назавуць пераможцаў.

Дакументы на конкурс прымаюцца да 1 лістапада, а сам ён прадоўжыцца да канца бягучага года.

**Вольга ШЧАДРЫНА,**
**Белінфарм.**

# РАМАНАЎСКАЕ СВЯТА

У першую нядзелю кастрычніка тыя, хто цікавіцца нашай спадчынай, шануе яе, сабраліся на свята, прымеркаванае да 140-годдзя з дня нараджэння Еўдакіма Раманава -- фальклaрыста, этнографа, гісторыка, археолага. Гэты чалавек усё сваё свядомае жыццё прысвяціў служэнню народу, адстойваў годнасць беларусаў і іх права на самабытную нацыянальную культуру.

Цікавыя мерапрыемствы, прысвечаныя гэтаму чалавеку-падзвіжніку, праводзяцца на Гомельшчыне не ўпершыню. Так, у мінулым годзе адбылася канферэнцыя, у якой удзельнічалі навукоўцы з г.Мінска, ВНУ горада і вобласці, супрацоўнікі музеяў.

Е.Раманаў -- наш зямляк, нарадзіўся ў Навабеліцы. Таму сёлета гэта свята і праводзілася на тэрыторыі гэтага раёна ў кінатэатры "Мір". Яго ўступным словам аб жыцці і творчым шляху Еўдакіма Раманава адкрыў намеснік дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта, кандыдат гістарычных навук Г.А.Аляксейчанка. З паведамленнем пра Раманава-фальклaрыста выступіла дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.С.Новак. Вяла свята старшыня гарадской рады Таварыства беларускай мовы В.А.Башлакова. Удзельнікам мерапрыемства былі прапанаваны такса ма фрагменты беларускага вяселля ў выкананні членаў "Талакі", якую ўзначальвае С.Вінаградаў. Затым усіх гасцей і ўдзельнікаў свята запрасілі ў бібліятэку, дзе яе супрацоўнікамі была аформлена невялікая выстаўка пра жыццё і творчасць Е.Раманава, змаглі яны пачаставацца і смачнымі, апетытнымі дранікамі, гарачай гарбатай.

Старанна рыхтаваліся да гэтай падзеі і работнікі Гомельскага краязнаўчага музея, якія аформілі экспазіцыю беларускіх народных строяў і далі да яе падрабязныя каментарыі.

У сьяце прымалі ўдзел выкладчыкі і студэнты гісторыка-юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў ГДУ.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

# ІТАЛІЯ СТАЛА БОЛЬШ БЛІЗКАЙ

## ТАМ АЗДАРАЎЛЯЛІСЯ НАШЫ ДЗЕЦІ

Мінулае лета абяцала многім дзецям выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ падарожжа ў далёкую Італію. Упершыню універсітэту прадставілася магчымасць, дзякуючы Фонду "Дапамога дзецям Чарнобыля", адправіць туды на аздараўленне ўсіх хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце ад 8 да 12 гадоў. Паездкі чакалі з асаблівай нецярплівасцю і хваляваннем і самі дзеці, і іх бацькі. Праўда, засмуціла ўсіх, што тэрміны выезду затрымліваліся да няпэўнага часу і юныя "падарожнікі" прасядзелі ў чаканні на чэмаданах не адзін тыдзень ліпеня і жніўня. Аднак цяпер аб тых непаразуменнях дзеці ўжо і не ўспамінаюць, настолькі моцнымі аказаліся ў іх уражанні ад адпачынку ў краіне ля берагоў Міжземнага мора. Большасць хлопчыкаў і дзяўчынак засталіся вельмі задаволенымі цёплым прыёмам, які ім аказалі ў італьянскіх сем"ях.

А нядаўна ў Гомель прыязджала вялікая група італьянцаў з вострава Сардзінія, дзе адпачывалі нашы дзеці. Яе ўзначальваў кіраўнік фонду, які адказвае ў мясцовай мэрыі за аздараўленне дзяцей з Беларусі. Яны прывезлі падарункі, пісьмы, відэакасеты хлопчыкам і дзяўчынкам ад іх былых гаспадароў. Многія з іх змаглі пабываць у гасцях у сем"ях, пазнаёміліся бліжэй з бацькамі хлопчыкаў і дзяўчынак, якіх прымалі летам у сябе. Завязаліся больш цесныя кантакты, дзякуючы якім многія дзеці і на наступнае лета змогуць па запрашэннях італьянскіх сяброў зноў прыехаць да іх у госці.

Далёкая Італія становіцца ўсё больш блізкай для беларускай дзятвы з чарнобыльскай зоны.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**Навуковыя канферэнцыі**

# ПА АКТУАЛЬНАЙ ПРАБЛЕМЕ

У Мінску на базе Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта адбылася рэспубліканская навукова-тэхнічная канферэнцыя "Аўтаматычны кантроль і кіраванне вытворчымі працэсамі". Яе арганізатарамі сталі Міністэрства адукацыі і навукі, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт, канцэрн "Белхімнафтапрам".

Вучонымі Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіны быў прачытаны 91 даклад у пяці рабочых секцыях канферэнцыі: аўтаматычны кантроль; аўтаматычнае і аўтаматызаванае кіраванне; матэматычныя метады ў тэорыі сістэм; мадэляванне аб"ектаў і сістэм кіравання; адукацыя і падрыхтоўка спецыялістаў у галіне аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў.

ГДУ імя Ф.Скарыны быў прадстаўлены 8 дакладамі ў чатырох секцыях.

Галоўная задача канферэнцыі: "Інтэграцыя інтэлектуальнага патэнцыялу рэспублікі для рашэння актуальных задач і ацэнкі навуковых і практычных дасягненняў у галіне аўтаматызацыі вытворчых працэсаў" была выканана.

**В.СЕРАБРАКОЎ.**

# МОЖНА АДПАЧЫВАЦЬ СПАКОЙНА

Упэўнена, што многія заўважалі на дыскатэках і вечарах, якія праводзяцца ў нашым універсітэце, рабят у акуратных чорных касцюмах з карткамі-візіткамі на грудзях. Гэтыя рабяты - нашы студэнты. Яны вырашылі дапамагчы нам з вамі спакойна адпачываць у вольны ад вучобы час. Хутка ў рабят, якія арганізавалі ва універсітэце спецыялізаваны студэнцкі атрад па ахове бяспекі, а проста -- службу бяспекі, будзе юбілей. Ім споўніцца год.

Напярэдадні гэтай немалаважнай падзеі, а таксама адкрыцця новага культурнага сезона універсітэта я вырашыла паразмаўляць з начальнікам службы бяспекі Андрэем СЫЦЬКО.

*-- Андрэй, перш за ўсё, скажы, каму прыйшла ў галаву думка стварыць такую службу?*

-- Усё пачалося з юбілею СТЭМа ў мінулым годзе, калі студэнты факультэта фізічнай культуры не справіліся з аховай парадку, і гэта давялося рабіць мне, Аляксандру Коцікаву і Марыне Шырынкінай. Тады нам з Сашам і прыйшла ў галаву такая думка. Пару вечароў пайшло на абмеркаванне гэтай ідэі, а потым мы пайшлі




да А.В.Лысянкова і прапанавалі свае паслугі. Ён падтрымаў нас. Так і нарадзілася СБ пры культурным цэнтры ГДУ. Мы набралі каманду з 8-мі чалавек. Правялі пару пробных мерапрыемстваў, у нас атрымалася. Быў напісаны наш статут, на падставе якога мы сталі ажыццяўляць сваю дзейнасць.

*-- І атрымалася так, што вы былі патрэбны...*

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 5 СТАР.)



# ПАМЯЦІ ПРАФЕСАРА Ф.М.ХАРЫТАНОВІЧА

На біялагічным факультэце адбыўся пашыраны Савет, прысвечаны памяці прафесара Ф.М. Харытановіча (90-годдзю з дня яго нараджэння). Гэты чалавек усё жыццё аддаў служэнню навуцы і падрыхтоўцы кадраў. Яго работы ў галіне лесавырошчвання , практыкі лесаводства і сёння з"яўляюцца асноватворнымі. Ф.М.Харытановіч адносіўся да плеяды тых вучоных, якія прайшлі цяжкі шлях станаўлення біялагічнай навукі і з гонарам вытрымалі гэтыя выпрабаванні. Правядзенне дня памяці вучонага было значнай падзеяй на факультэце для выкладчыкаў і студэнтаў. Усе мы адчулі непарыўную сувязь часоў. Запрошаныя на Савет студэнты пачэрпнулі бясцэнныя веды з успамінаў сына і дачкі Ф.М.Харытановіча д.т.н. Энглена Фёдаравіча і дацэнта Наталлі Фёдараўны, якія прынялі ўдзел у гэтым мерапрыемстве. З вялікім задавальненнем былі выслуханы паведамленні загадчыка аддзела экалогіі гарвыканкома А.Ф.Цітова і начальніка гарадской інспекцыі па экалогіі М.В.Сафонава, а таксама доктара сельскагаспадарчых навук А.М.Кажэўнікава (Інстытут лесу АН РБ). І гэта не выпадкова, бо пытанням экалогіі Ф.М. Харытановіч удзяляў самую непасрэдную ўвагу. Яго можна лічыць адным з асноватворцаў лясной экалогіі. Дэкан факультэта С.Ф.Алешка абвясціў прывітанне і пажаданне паспяховага правядзення дня памяці прафесара Ф.М.Харытановіча ад рэктарата універсітэта.



Выступае дачка М.Ф.Харытановіча Наталля Фёдараўна.



Кожнае выступленне слухалі з вялікай увагай.

На біялагічным факультэце становяцца традыцыйнымі сустрэчы з вучонымі і кіраўнікамі падраздзяленняў горада, бо толькі на падставе паслядоўнасці, знаёмства студэнтаў з экалагічнымі і агульнабіялагічнымі праблемамі рэгіёна, навуковымі дасягненнямі можна сфарміраваць сапраўднага спецыяліста для нашага грамадства.

**С.АЛЕШКА, дэкан біялагічнага факультэта.**
**В.ВАЛЕТАЎ, доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.**
**Фота У.Чысціка.**

# МОЖНА АДПАЧЫВАЦЬ СПАКОЙНА

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 4 СТАР.)

-- Так, наш народ любіць весяліцца культурна. Але часам здараюцца зрывы і вось тады патрэбны мы. Наша задача -- назіраць за парадкам і забяспечваць спакойны адпачынак і бяспечныя зносіны, нейтралізаваць непрыемныя інцыдэнты, выпраўджваць парушальнікаў. І ўсё гэта, не прыбягаючы да сілы, а засноўваючыся псіхалагічным фактарам. Па водгуках студэнтаў, адпачываць стала спакайней.

*-- Андрэй, ты сказаў: выпраўджваць парушальнікаў. Гэта добра, калі чалавек разумее мову, а сустракаюцца ж і такія, што дзейнічаюць па прымаўцы: "Ты яго ў дзверы, а ён -- у вакно".*

-- Так, сустракаюцца і такія, але трэба сказаць, што ў нас наладжаны цесныя сувязі з міліцыяй, і мы ёй даставілі не аднаго кліента. Вось, напрыклад, такі выпадак: у "Дні фізікаў" праходзіў канцэрт і адзін мужчына, напіўшыся практычна да беспрытомнасці, спрабаваў вынесці магнітафон, з якім на канцэрце працавалі нашы аператары. Мы яго затрымалі, здалі з рук у рукі міліцыянерам.

*-- Ну а далей?*

-- Далей быў суд, дзе я і яшчэ адзін чалавек з нашай каманды былі сведкамі. Шукальнік лёгкай нажывы атрымаў 3 гады з абавязковым прыцягненнем да працы.

*-- Андрэй, ты кажаш, што вы стараецеся не прыбягаць да сілы і грубасці. Ці так гэта? І ці заўсёды ўдаецца?*

-- Гэта сапраўды так, але гэта ўдаецца не заўсёды. Зразумей, калі стаіш каля дзвярэй 3-4 гадзіны і адштурхоўваеш натоўп, які жадае трапіць у залу без білета, слухаеш іх пагрозы аб тым, што табе не жыць, часам не вытрымліваюць самыя жалезныя нервы. Але ў асноўным стараешся ветліва растлумачыць і ўжо тым больш не прымяняць сілу. Хаця ўсе рабяты займаліся каратэ і валодаюць прыёмамі барацьбы.

*-- Дык хто ж уваходзіць у вашу каманду?*

-- У нас, як я ўжо казаў, 8 чалавек: 2 будучых юрысты, 3-праграмісты і 3-эканамісты. Гэта я, мой намеснік -- Аляксандр Коцікаў, Яўген Марчанка, Андрэй Фоцін, Аляксандар Роскач, Станіслаў Серада, Леанід Палееў, Ігар Базыкін і яшчэ адзін чалавек, стажор, які будзе прыняты ў каманду на агульным сходзе, пасля таго, як адпрацуе з намі тры мерапрыемствы, свайго роду выпрабавальны тэрмін.

*-- І, канешне, традыцыйнае пытанне: якія планы на будучае?*

-- Планаў шмат, але галоўнае, чаго б мы жадалі, гэта афіцыйнага прызнання нас ва універсітэце. Студэнты нас ужо прызналі, а вось адміністрацыя... Гэта і было б лепшым падарункам да нашага дня нараджэння.

**А.КАДОЛ, студэнтка III курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**

## Вачыма замежных гасцей

***Вясной бягучага года наш універсітэт наведалі дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў ЗША доктар Вітаўт Кіпель і яго жонка -- навуковая супрацоўніца славянскага аддзела Нью-Йоркскай Публічнай бібліятэкі Зора Кіпель. На нашай зямлі ў іх адбылося шмат запамінальных сустрэч. Вялікае ўражанне ў гасцей з Амерыкі засталося і ад Другога Міжнароднага кангрэсу беларусістаў, які праходзіў 16-18 мая ў Мінску, і яны прымалі ў ім удзел у якасці дэлегатаў, выступілі з дакладамі на секцыі дыяспары беларусістаў блізкага і далёкага замежжа.***

***Дарэчы, доктар Вітаўт Кіпель выбраны віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, а на заключным пленарным пасяджэнні кангрэсу яму быў уручаны дыплом паўнапраўнага члена Міжнароднай Акадэміі Навук.***

***Пасля вяртання ў ЗША Зора Кіпель у газеце беларусаў "Беларус", якая выдаецца ўжо 44-ы год, падзялілася сваімі ўражаннямі, якія глыбока кранулі яе сэрца пры наведванні Гомельшчыны і г.Крычава, дзе прайшло яе дзяцінства.***

***Прапануемая чытачам публікацыя Зоры Кіпель перадрукоўваецца не ў арыгінале, а ў адпаведнасці з сучасным беларускім правапісам.***

## ПАДАРОЖЖА ПА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Сёлетні наш побыт у Беларусі быў з аднаго боку вельмі памысны і цікавы, а з другога -- поўны трывогі, роспачы і крыўды. Трывогі за будучыню Беларусі, крыўды і роспачы за свой народ. Але пра прыкры бок я пісаць не буду -- шмат ужо перагаворана і напісана, тым болей, што аб гэтым гаварыць і пісаць недастаткова -- трэба нешта рабіць, адрабляць.

Пашчасціла нам быць гасцьмі Гомельскага універсітэта. Гаспадары нашыя, рэктар Л.А.Шамяткоў і прафесар Уладзімір Анічэнка не толькі выдатна арганізавалі наш побыт у Гомелі, спатканне са студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта, наведванне лабараторый: скарынінскай, лінгвістычнай і краязнаўчай, але наладзілі і шэраг экскурсій па Гомельшчыне.

Кантакты нашыя з Гомельскім універсітэтам пачаліся ўжо пару гадоў таму, калі універсітэт звярнуўся да Беларускага інстытута навукі і мастацтва з запытам аб літаратуры пра Скарыну, што выдавалася на Захадзе, для скарынаўскай лабараторыі-музея. Варта тут заўважыць, што гэта, бадай, самы вялікі збор Скарыніяны на цэлым свеце -- сабраныя там і кнігі, і артыкулы, і мастацкія творы, і музейныя экспанаты, якія тычацца жыцця і дзейнасці першадрукара. Сапраўды такая лабараторыя патрэбна універсітэту, які носіць імя Скарыны.

Аб Гомелі, прызнацца, веды мае былі вельмі сціплыя. Ведала, што горад стары, адзін з большых у Беларусі, горад індустрыяльны, амаль цалкам знішчаны у другую сусветную вайну.

На прыемнае здзіўленне, Гомель, у часе нашай першай передвечаровай экскурсіі, выявіўся прыгожым гістарычным месцам над Сожам, поўным цікавых архітэктурных помнікаў.

Пачынала цямнець, а нам усё не хацелася пакідаць гэты гістарычны прыемны куток Гомеля.

Назаўтра падарожжа яшчэ далей на ўсход ад Гомеля, глыбей у гэтак званую "зону".

Перш-наперш у Ветку, у мясціну беларускіх стараавераў. 10 гадоў таму заснаваўся тут этнаграфічны музей, які да пэўнай ступені адлюстроўвае культуру старавераў ваколіцы. Музей гэты, пра які мы ўжо шмат чулі, і прыцягнуў нас у Ветку. Кіраўніца музея, спадарыня Нячаева, вельмі дасведчаны этнограф, паказала нам выключна прыгожыя і рэдкія іконы старавераў у багатых кіётах, шытыя бісерам -- рамяство, якое вядома пераважна ў Веткаўскім рэгіёне. Расказала яна нам таксама пра семантыку ўзораў ручнікоў мясцовых ткачых, дзе кожны ўзор нешта значыць, нешта апавядае. Шмат часу яшчэ можна было б там правесці, але спяшаліся мы далей, у Неглюбку.

Па дарозе цешыла вока прырода, палі, лугі, яшчэ месцамі затопленыя веснавой паводкай бярозавыя ляскі, прыдарожныя вёсачкі, зграбныя хаты са своеасаблівымі арнаментамі, найчасцей каляровымі, надваконнікамі-ліштвамі. Не магла я нацешыцца цікавай беларускай тапанімікай -- назвамі вёсак і мястэчкаў /толькі па-беларуску/ на дарожных знаках: Навасёлкі, Бесядзь, Свінка, Старое Залужжа, Новыя Грамыкі, Свяцілавічы, Стаўбунь. Адзін з такіх знакаў накіраваў на Барталамееўку -- вёску, якая была цалкам выселена пасля чарнобыльскай катастрофы.

Заехалі з дарогі ў вёсачку -- кінутую, пустую, бязлюдную. Праўда, недзе ўдалечыні заўважылі сабаку, а пасля і чалавека -- мусіць, нейкая адважная, непахісная асоба, што рашыла не пакідаць свайго. Хаткі забітыя , апусцелыя, а каля адной... цвіце яблынька.

У гэты прыгожы, цёплы травеньскі дзень ніяк не хацелася думаць пра трагедыю, тым больш, што вонкава трагедыі гэтай і не заўважаецца -- мясцовыя людзі жывуць нібыта нармальным жыццём, нейак стараюцца ад яе адхінуцца, забыцца, не ўспамінаць -- можа яно і міне.

Недалёка ад Неглюбкі, пры дарозе невялікі магільнік, яшчэ свежа ўвешаны ручнікамі пасля Радаўніцы.

А вось і Неглюбка -- вёска здаўна славутая сваімі ручнікамі, дзе амаль у кожнай хаце жанчына -- ткачыха, мастак свайго роду, вырабляе адменныя ручнікі пераборнага аднаковага ткацтва. Тут мы знайшлі і нашу ткачыху Таццяну Дзеранок, якая некалі, у 70-х гадах, з дыпламатамі са Злучаных Нацый перадала ручнік сваёй работы для беларусаў Амерыкі.

Майстэрства сваё старэйшыя жанчыны перадаюць маладзейшым і зусім маладым. Пры школе заснавана ткацкая майстэрня, дзе школьніцы старэйшых класаў ужо ткуць ручнікі, за якія не сорамна было б і спрактыкаваным ткачыхам.

Так не хацелася пакідаць гэтай цікавай гасціннай вёскі, што ляжыць на самай усходняй мяжы сённяшняй Рэспублікі Беларус ь. "Пагуляйце, пагуляйце", -- усё ўгаворвала нас Таццяна, але трэба было ехаць, бо ў Гомелі яшчэ запланаванае спатканне са с тудэнтамі.

Не было б поўным маё апавяданне, каб не ўспомніла хоць колькімі словамі горад Крычаў. Вяртаючыся з Гомеля назад у Мінск, наш уважлівы дбалы апякун сп. Анічэнка быў ласкавы яшчэ зрабіць даволі вялікі круг і падкінуць нас у г.Крычаў, дзе прайшлі некалькі маіх дзіцячых гадоў.

Крычава майго дзяцінства я амаль не пазнала. Толькі як убачыла стары палац і роў, дзе я калісь 8-мі-9-ці-гадовым дзяўчом лазіла з сябрамі, дык у памяці ўсё ўсплыло. Зноў прабегла я /адкуль энергія ўзялася/ на цянькі праз роў, знайшла хату, дзе некалі жылі, спаткала нават і цяперашняга спадара хаты, а тады бялявага, 6-гадовага хлапчука Лёньку, унука нашых былых гаспадароў, які, як я толькі сказала, што я Зора, адразу ж пазнаў мяне, і прывіталіся мы як старыя сябры -- зноў пабывала я дома.

**ЗОРА КІПЕЛЬ.**



*Спонсар конкурсу - прафком студэнтаў ГДУ імя Ф.Скарыны*

**Агульнауніверсітэцкі конкурс "Ану, першакурснік!" 1995 г. праводзіцца 29 кастрычніка з 15.00 у актавай зале ГДУ. Білеты на мерапрыемства будуць распаўсюджвацца праз культурны цэнтр ГДУ і культоргаў на факультэтах.**

## ПАЛАЖЭННЕ

### аб правядзенні агульнауніверсітэцкага конкурсу "Ану, першакурснік!" 1995-96 навучальнага года.






Кожны год ва універсітэце праводзіцца конкурс мастацкай самадзейнасці з мэтай развіцця творчай ініцыятывы, культурнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў. Адным з этапаў гэтага конкурсу сярод студэнтаў 1-га курса з'яўляецца "Ану, першакурснік!".

У конкурсе прымаюць удзел толькі студэнты 1-га курса. Дапускаецца акампанемент з боку, а таксама ўдзел не першакурснікаў у парных выступленнях для цэласнасці і мастацкага ўзроўню нумара.

Працягласць выступлення кожнай групы -- не больш 40 мінут (з іх 5 мінут -- кантрольных).

Час на падрыхтоўку перад выступленнем - - 5 мінут.

Конкурсныя праграмы павінны быць прадстаўлены для паказу 24 і 25 кастрычніка і 27 кастрычніка зацверджаны для ўдзелу ў конкурсе.

Да 27 кастрычніка павінны быць прадстаўлены аддрукаваныя праграмы ў колькасці 10 экземпляраў.

У гэтым годзе калектывы рыхтуюць свае праграмы па абавязковай тэматыцы "АХ, ШТО ЗА ЦУД ГЭТЫЯ КАЗКІ !.." Непасрэдна выбар жанру, у якім рыхтуецца праграма, самастойны. Праграма павінна быць змястоўнай, цікавай і разгорнутай па тэматыцы.

Праграма ацэньваецца па 15-бальнай сістэме.

Парадак выступленняў вызначаны па зваротнаму парадку занятых месцаў групамі першакурснікаў мінулага года.

Журы адзначыць лепшую аўтарскую работу, лепшых вядучых, выканаўчае майстэрства.

Вынікі конкурсу і ўзнагароджанне прызамі з уручэннем пераходнага прыза адбудзецца пасля заканчэння конкурсу ў той жа вечар.

Праграмы ацэньваюцца журы ў складзе:

-- ЛЫСЯНКОЎ А.В. -- дырэктар культурнага цэнтра ГДУ.

-- ШЫРЫНКІНА М.Б. -- мастацкі кіраўнік.

-- КАЗЛОЎ М.А. -- кіраўнік народнай харавой капэлы "Дзянніца".

-- ВАРОНІН Г.І. -- кіраўнік беларускага тэатра "Калі б..."

-- ЭБЗЕЕВА А.М. -- кіраўнік фальклорнага калектыву.

-- Прадстаўнік рэктарата.

-- Прадстаўнік прафкома.

Палажэнне аб конкурсе прынята мастацкім саветам культурнага цэнтра ГДУ імя Ф.Скарыны 22 верасня 1995 года . Тэл. для даведак: 57-33-30.

### "РАДЗІМІЧЫ" ЧАКАЮЦЬ ВАС

**Аб'яўляецца дадатковы набор юнакоў у народны фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Радзімічы".**

**Звяртацца штодзённа ў актавую залу універсітэта з 19.00.**

**КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР ГДУ.**

**Алла БРЕДИХИНА,**
**студентка заочного факультета**

## Осенняя страничка

◆◆◆

*Октябрь вступил в свои права,*
*Раскинув свой шатер,*
*Осинки робкой голова*
*Пылает,как костер,*
*А златокудрые березы*
*Роняют листья,точно слезы.*
*Печальных птиц прощальный крик*
*Доносится,как стон,*
*От ветра горбясь,как старик,*
*Теряет листья клен.*
*Так осень гордая всегда*
*Сыпнув дождем,уходит,*
*Хоть молча плачет иногда,*
*Но уходить не хочет.*

*Забрав все краски,все цветы,*
*Раздев деревья и кусты,*
*Собрав весь дождь в большую чашу,*
*Ушла, лишь грусть оставив нашу.*



## БУДЗЬЦЕ ГРАЦЫЁЗНЫМІ!

Ва універсітэце створана група стэпа і спартыўнай аэробікі. Студэнткам, якія жадаюць займацца, звяртацца ў спартыўную залу вуч. корпуса N 2 /вул.Кірава, 119/ па аўторках, чацвяргах -- з 17.00 да 18.30 і ў суботу -- з 14.00 да 15.30.

СПОРТ

## ЗНОЎ МАЦНЕЙШАЯ Ў СВЕЦЕ

У г.Кустанаі прайшоў IV чэмпіянат свету па паліятлону. У ім прынялі ўдзел шматборцы з Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, Беларусі і Казахстана.

У агульнакамандным заліку беларускія спартсменкі ўступілі толькі камандам Расіі і Казахстана.

Двухразовая чэмпіёнка свету выкладчыца кафедры фізічнага выхавання нашага універсітэта Галіна Галаўнёва зноў прадэманстравала неўвядальнае спартыўнае майстэрства. Выступаючы ва ўзроставай групе 45-49 гадоў, майстар спорту Г.Галаўнёва ўзнялася на вышэйшую прыступку п"едэстала гонару.

## У КАНЦЫ СПАРТЫЎНАГА СЕЗОНА

У бельгійскім горадзе Льежы разыгрываўся Кубак Еўропы па лёгкай атлетыцы сярод клубных каманд. Сапернічалі каманды Германіі /дзве/, Францыі, Турцыі, Босніі, Беларусі і Бельгіі /дзве/.

Беларусь прадстаўляла гомельская каманда "Сож", за якую выступалі і нашы студэнты: Аляксандр Слюнькоў перамог у бегу на 100 м і быў трэцім у эстафетным бегу 4х100 м, Яўген Пудакоў быў другім у кіданні дыска і трэцім -- у штурханні ядра, Валянцін Борсук і Аляксандр Цумакоў ў эстафетнай камандзе 4х100 м заваявалі бронзавыя ўзнагароды.

Гамяльчане ў выніку заваявалі 5 залатых, 9 сярэбраных і 6 бронзавых ўзнагарод, а ў агульнакамандным заліку нашы землякі [illegible], на трэцім месцы -- Германія. [illegible]о нашых студэнтаў трэніруюць [illegible]

**В.МАРЧАНКА.**

## [illegible]АТЛЕТЫЧНЫ

[illegible]йшлі спаборніцтвы па асенняму [illegible]раме II спартакіяды студэнтаў [illegible]рада.

[illegible]акультэтаў ГДУ імя Ф.Скарыны, [illegible]ага і політэхнічнага інстытутаў. [illegible]дзел звыш 350 студэнтаў.

[illegible]цамі сталі лёгкаатлеты факультэ[illegible]ерсітэта. Яны набралі 661 ачко. [illegible] студэнты БелДУТа. На рахунку [illegible] працэсам перавозак -- 518 ачкоў, 462 -- факультэта прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва.

У асабістым заліку на дыстанцыі 500 м сярод дзяўчат першае і другое месцы падзялілі студэнткі А.Кандраценка з факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта і І.Пятрова з факультэта кіравання працэсамі перавозак БелДУТа. Яны выступалі ў розных забегах, але паказалі аднолькавы вынік -- 1.33. На 2 сек. адстала ад іх І.Саўчанка з факультэта прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва, якая аказалася трэцяй.

Сярод юнакоў на кіламетровай дыстанцыі ўсе прызавыя месцы занялі студэнты факультэта фізічнай культуры. З вынікам 2.30 першым на фінішы быў А.Шытаў. На 1 сек. адстаў ад яго Д.Шкалёў . Трэцім фінішаваў С.Шышоў -- 2.35.

**М.БАЛЬ, студэнт II курса філалагічнага факультэта.**



**Дарога ў Альпах.** Здымак зроблены нашым фотакарэспандэнтам У.Чысцікам, які сёлета з групай альпіністаў пабываў у Італіі.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- оптыкі -- дацэнта;
-- матэматычнага аналізу -- дацэнта;
-- ВМ і праграміравання -- дацэнта;
-- эканамічнай інфарматыкі і АСК -- дацэнта;
-- псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі -- ст.выкладчыка, дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Дэканат факультэта фізічнай культуры, калектыў кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры выказваюць спачуванне лабаранту **МАЖАЙСКАМУ Паўлу Фёдаравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- заўчаснай смерці **ДАЧКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.
За якасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 580.
Падпісана да друку 13.10.95.